**ЗАКЛЮЧЭННЕ**

савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

па дысертацыі Калтачэнка Аліны Ігараўны «Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.**

Савет па абароне дысертацый Д 02.21.03 адзначае, што дысертацыя Калтачэнка А. І. «Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.» адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навукі – гістарычныя.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яе значнасці.**

Дысертацыя з'яўляецца першай ў беларускай гістарычнай навуцы працай, у якой сістэмна даследаваны адукацыйныя падарожжы эліт ВКЛ у Заходнюю Еўропу у XVI–XVIII стст., іх эвалюцыя і спецыфіка ў параўнанні з адукацыйнымі падарожжамі іншых сацыяльных груп насельніцтва ВКЛ, а таксама праведзены іх функцыянальны аналіз у агульнаеўрапейскім культурна-гістарычным кантэксце. На падставе выкарыстання шырокага кола інфармацыі дакументальных гістарычных крыніц і спецыяльнай навуковай літаратуры раскрыты фактары ўзнікнення феномену выязной адукацыі ў XVI ст., прааналізаваны структурныя трансфармацыі дадзенай з'явы ў XVII–XVIII стст., выяўлены асаблівасці падрыхтоўкі, змест вучэбных праграм і геаграфія адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ, праведзена гістарычная рэканструкцыя адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў родаў Сапегаў і Радзівілаў.

**Навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.**

Савет па абароне дысертацый Д 02.21.03 прысуджае А. І. Калтачэнка вучоную ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

першае ў айчыннай гістарыяграфіі сістэмнае даследаванне адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх родаў ВКЛ ва ўніверсітэты і іншыя навучальныя ўстановы Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.;

выяўленне прычын (аслабленне ўплыву царквы на ўніверсітэцкую адукацыю, адкрыццё новых навучальных устаноў з іншымі адукацыйнымі праграмамі, узнікненне цікавасці да адукацыі сярод прадстаўнікоў эліты) ўзнікнення адукацыйных падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст., вызначэнне іх асноўных функцый у сістэме элітарнай адукацыі і устанаўленне ролі гэтых падарожжаў у працэсе інтэграцыі ВКЛ у агульнаеўрапейскую культурную і палітычную прастору;

абгрунтаванне двух тыпаў адукацыйных падарожжаў эліт ВКЛ ў XVI–XVIII стст.: «peregrinatio academica» ці «акадэмічнае падарожжа» і «Grand Tour» альбо «вялікае падарожжа за ведамі»;

вызначэнне спецыфікі адукацыйных падарожжаў магнатаў, якая ўключала наяўнасць «перасоўнага» двара, атрыманне вайсковай адукацыі поруч з вывучэннем замежных моў, гісторыі, філасофіі і іншых навук для паглыблення эрудыцыі, наведванне тэатраў ваенных дзеянняў і інш.;

выяўленне сувязі замежных адукацыйных практык эліт ВКЛ з працэсамі рэфармавання ўніверсітэцкай адукацыі падчас Рэфармацыі, Контррэфармацыі і ў эпоху Асветніцтва ў Заходняй Еўропе;

раскрыццё спецыфікі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў ВКЛ на падставе апякунскай карэспандэнцыі і дыярыушаў, што знайшло сваё ўвасабленне ў рэканструкцыі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў родаў Сапегаў у першай чвэрці XVII ст. і Радзівілаў у апошняй чвэрці XVII ст.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў навукова-даследчай дзейнасці пры распрацоўцы пытанняў, звязаных з гісторыяй адукацыі і падарожжаў з тэрыторыі Беларусі, гісторыяй культуры і канфесійнай гісторыяй XVI–XVIII стст. Матэрыялы дысертацыі могуць быць запатрабаваны ў адукацыйным працэсе ў ВНУ Рэспублікі Беларусь, пры падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў, спецыяльных лекцыйных курсаў, напісанні магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь для ўдасканалення музейных экспазіцый і арганізацыі экскурсійных маршрутаў.

Старшыня савета
па абароне дысертацый — А.П.Жытко

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — А.А.Сурма

21.01.2026